16. Роднае слова. – 2003. – № 10. – С .6-7.
17. Маладосць. – 1993. – № 8. – С. 203-209.
18. Цэнтр. навук. бібл. НАН Беларусі, Ф.23, Воп.1, Спр.67, Арк.1.
19. З гісторыяй на ”Вы”: артыкулы, дакументы, успаміны. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. – 351 с.
20. Роднае слова. – 1996. – № 3. – С. 90-93.
21. Неман. – 1988. – № 9. – С. 156-163.

## ПЛАН СТВАРЭННЯ БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ВАЙСКОВЫХ ФАРМІРАВАННЯЎ І ІХ ДЗЕЙНАСЦЬ У 1918-1923 гг.

Багалейша С.В., кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Агульнавядома, што ні адна нацыя не ў стане дасягнуць незалежнай дзяржаўнасці без стварэння ўласных узброеных сілаў. У гады Першай сусветнай вайны пэўныя захады ў гэтым накірунку рабілі і беларускія нацыянальна-свядомыя дзеячы. Аднак, падчас нямецкай акупацыі урад БНР не здолеў стварыць сваю збройную сілу. З нагоды гэтага, беларускія дзеячы пайшлі на больш цеснае вайсковае супрацоўніцтва з літоўскім урадам і гэта з’явілася адным з накірункаў беларуска-літоўскіх узаемаадносін у 1918-1923 гг.

Гэтае пытанне вельмі слаба раскрыта ў нашай навуковай гістарычнай літаратуры, ёсць толькі некаторыя фрагменты і эпізоды, якія датычацца азначанай праблемы.

Беларускія вайсковыя часткі ў Літве адыгралі значную ролю ў абароне незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці нашай Радзімы – Беларусі і толькі неспрыяльная гістарычная сітуацыя не дала ім магчымасці разгарнуцца ў войска, якое б не на словах, а са зброяй у руках абараняла родную зямлю ад чужынцаў.

27 лістапада 1918 г. паміж урадам БНР і літоўскай Тарыбай (урадам Літвы) быў заключаны дагавор аб супрацоўніцтве. Адной з умоў дамовы і было стварэнне беларускіх вайсковых фарміраванняў у Літве [1, с. 297-298]. Дзеля гэтага ўтваралася Міністэрства беларускіх спраў пры літоўскім урадзе, якое павінна было кантраляваць фарміраванне беларускіх вайсковых адзінак у Літве. Унутры Міністэрства ствараўся вайсковы сакратарыят, асноўнымі функцыямі якога былі: фарміраванне беларускіх вайсковых частак,

прызначэнне вышэйшага і ніжэйшага каманднага складу, вырашэнне ўсіх пытанняў, звязаных з забеспячэннем і развіццём беларускіх частак літоўскай арміі [14, с. 3]. Менавіта пад гэту справу літоўскі бок і выдзяляў фінансавыя сродкі.

Згодна з дагаворам, беларускія вайсковыя фарміраванні падпарадкоўваліся літоўскаму галоўнакамандуючаму. Урад Літвы вельмі разлічваў на беларускія часткі, бо ваенныя сілы Літвы ў той час былі нязначнымі і знаходзіліся ў стане зародка, а пагроза ёй з боку Польшчы і Савецкай Расіі была рэальнай.

Першым міністрам абароны Літоўскай рэспублікі быў прафесар А. Вальдэмарас, а віцэ-міністрам – запрошаны з Мінска генерал расійскай арміі К.А. Кандратовіч, бо ў той час у літоўскім войску не хапала вопытных афіцэраў. Ён адначасова лічыўся “галоўным камандзірам беларускага войска”. Прызначэннем афіцэраў, якія лічыліся “беларускімі афіцэрамі літоўскай арміі”, у беларускія часткі займаўся літоўскі ўрад, але з санкцыі Міністэрства беларускіх спраў [12, с. 23]. Гэта былі ў асноўным афіцэры былой расійскай арміі, якія прайшлі Першую сусветную вайну. Згодна з беларуска-літоўскім дагаворам ад 27 лістапада 1918 г. беларускія і літоўскія вайсковыя адзінкі павінны былі фарміравацца па прынцыпу колькаснага парытэту, што, аднак, выклікала нездаволенасць сярод літоўскіх афіцэраў, якія настойвалі на колькаснай большасці літоўскіх адзінак.

Згодна з загадам генерала К. Кандратовіча ад 12 снежня 1918 г. планавалася стварыць беларускую брыгаду ў складзе 2-х стралецкіх палкоў ці 6 батальёнаў, асобны артылерыйскі дывізіён, кавалерыйскі полк і інжынерную роту – ўсяго 8 – 10 тыс. чалавек. Праект прадугледжваў дыслакацыю беларускіх аддзелаў у Гродна, Беластоку, Лідзе, Ваўкавыску. Прыкладна 15 снежня 1918 г. у атэлі “Метраполь” у Гродна было адчынена бюро па рэгістрацыі добраахвотнікаў у Першы беларускі полк [11].

Фарміраванне беларуска-літоўскага войска пачалося ў Вільні ў канцы 1918 г. Былі сфарміраваны штабы 1-га і 2-га літоўскіх і 1-га і 2-га беларускіх палкоў. Пасля выезда з Вільні фарміраванні літоўцаў былі пераведзены ў Коўна, беларусаў – у Гродна. Фарміраванне літоўскіх частак на Ковеншчыне пайшло значна хутчэй, чым фарміраванне беларускіх у Гродна, якія мелі на гэта менш фінансавых сродкаў. Становішча ўскладнялася і прысутнасцю

нямецкіх войскаў. Увогуле, фарміраванне палка ішло марудна з-за недахопу сродкаў і памяшканняў. Яшчэ ў пачатку студзеня 1919 г. 1-ы беларускі полк пяхоты не меў узбраення і налічваў толькі 21 афіцэра. На чале яго стаяў палкоўнік М. Лаўрэнцьеў [14, с. 9].

1 снежня 1918 г. была ўтворана беларуская секцыя літоўскага Міністэрства абароны, якой кіраваў капітан Рэмішэўскі [6, с. 87]. Вайсковыя ступені ў беларускім войску былі аднолькавыя са ступенямі ў літоўскай арміі: старшыя афіцэры – палкоўнікі, палкоўнікі-лейтэнанты (г.з. падпалкоўнікі), маёры; малодшыя афіцэры – капітаны, старшыя лейтэнанты (падпаручыкі); ніжэйшы афіцэрскі склад – старэйшыя (узводныя) і малодшыя падафіцэры; салдаты. Генералаў ў беларускім войску, за выключэннем К.А. Кандратовіча, не было.

21 снежня 1918 г. на нарадзе Рады БНР быў заснаваны Савет дзяржаўнай абароны на чале з В. Ластоўскім і генералам К.А. Кандратовічам. У яго распараджэнне перадаваліся 1-ы беларускі полк, 2-і беларускі полк, Гродзенская камендатура і беларускі гусарскі эскадрон. Перад гэтымі сіламі ставілася задача аказваць супраціўленне ўсім, хто выступаў супраць незалежнай беларускай дзяржаўнасці.

У студзені 1919 г. Міністэрствам абароны літоўскага краю штаб 2-га беларускага палка быў расфарміраваны, а ў хуткім часе падаў у адстаўку і генерал Кандратовіч. Фарміраванне 1-га палка, беларускага эскадрону і беларускай камендатуры ў Гродна, тым не менш, працягвалася.

З канца 1918 г., як ужо адзначалася, цэнтрам беларуска-літоўскага супрацоўніцтва стала Гродна, дзе да красавіка 1919 г. ажыцяўлялася арганізацыя беларускага войска. Там жа працягвала сваю дзейнасць і Міністэрства беларускіх спраў пры літоўскім урадзе. Гродна на нейкі час стаў цэнтрам беларускага нацыянальнага руху, але беларускія арганізацыі вымушаны былі працаваць у вельмі складаных умовах. Становішча ўскладнялася свавольствам нямецкіх салдат. Так, у канцы студзеня 1919 г. нямецкія салдаты арыштавалі двух беларускіх афіцэраў, якія везлі 100 000 марак для арганізацыі беларускага палка ў Гродна, і забралі сабе грошы. Увогуле трэба адзначыць, што нямецкае камандаванне не вельмі добра ставілася да справы стварэння беларускіх вайсковых фарміраванняў.

На пачатку студзеня 1919 г. генерал К.А. Кандратовіч і міністр беларускіх спраў Я. Варонка атрымалі паведамленне ад нямецкіх уладаў аб тым, што Антанта абяцала дапамогу літоўцам і беларусам грашовымі сродкамі і ўзбраеннем для арганізацыі літоўска-беларускай арміі для барацьбы з бальшавікамі. Аднак на самой справе ўсё ішло маруднымі тэмпамі, асабліва ў адносінах да беларускіх адзінак [6, с. 90]. Немцы таксама доўгі час не хацелі выдаваць узбраенне беларускім павятовым міліцыянерам.

У той час у Гродна была створана Беларуская камендатура, потым 1-ы беларускі полк пяхоты і эскадрон кавалерыі. У другой палове лютага ў беларускіх частках налічвалася ўжо 80 афіцэраў. Аднак дысцыпліна сярод салдат была слабая, здараліся выпадкі п'янства, адбываліся спрэчкі, якія вымушаны былі ўрэгулёўваць немцы. Адначасова міністр беларускіх спраў Я. Варонка прыкладаў усе намаганні, каб непасрэдна пераняць кантроль над палком ад літоўскага Міністэрства аховы краю. 21 студзеня 1919 г. ён стварыў пры сваёй канцылярыі Вайсковы сакратарыят у складзе В Рыхтара, А. Рэшкі і Б. Гедрайціса, які сам і ўзначаліў. Галоўнай задачай сакратарыята была арганізацыя беларускіх вайсковых частак.

31 студзеня 1919 г. начальнікам штаба 1–га палка і кіраўніком Гродзенскай вайсковай акругі, якая ахоплівала 11 раёнаў, быў прызначаны М. Дзямідаў. 1 лютага ён выдаў загад №1 аб наборы добраахвотнікаў у 1-ы беларускі полк беларуска-літоўскай арміі. Вярбовачныя афіцэры былі накіраваны ў Ваўкавыск, Беласток, Слонім, Ліду, Пружаны, Кобрын, Васілішкі, Шчучын і іншыя мясціны. Гэта садзейнічала дастаткова хуткаму росту колькасці салдат.

У канцы лютага 1919 г. у Гродна прыязджаў упаўнаважаны літоўскага ўрада А. Жылінскі разам са сваім сакратаром Лазарайцісам, каб на месцы пазнаёміцца з фарміраваннем беларускага палка. Між іншым, А. Жылінскаму было даручана высветліць пытанне аб магчымай эвакуацыі беларускіх частак, калі гэта спатрэбіцца. Літоўскі ўпаўнаважаны разам з Я. Варонкам, палкоўнікам Б. Гедрайцісам і палкоўнікам М. Лаўрэнцьевым зрабіў першы агляд беларускага палка. А. Жылінскі абыйшоў усе роты, каманды, кухню, гутарыў з некаторымі асобнымі жаўнерамі, пасля чаго выступіў з прамовай. Аднак упаўнаважаны літоўскага ўрада застаўся незадаволены ўбачаным, бо справа фарміравання

беларускага палка, на яго думку, ішла даволі марудна.

4 сакавіка 1919 г. літоўскі ўрад запрасіў на пасаду камандзіра 1 га беларускага палка замест палкоўніка М. Лаўрэнцьева палкоўніка К. Езавітава [7, л. 42]. Ужо 9 сакавіка ён звярнуўся да Старшыні Рады Міністраў БНР з просьбай зацвердзіць абразцы формы для беларускай арміі [7, л. 43]. 27 сакавіка 1919 г. полк афіцыйна атрымаў назву 1-га беларуска-гродзенскага палка пяхоты [7, л. 42]. Ён налічваў 800 чалавек і складаўся з 4-х батальёнаў, якімі камандавалі палкоўнікі Гайдукевіч, Міхайлоўскі, Кузьмін-Караваеў і Волкаў. А. Латышонок лічыць, што 1-ы беларускі полк у той час складаўся з 4-х ротаў [6, с. 87].

У сваёй аўтабіяграфіі К. Езавітаў пісаў, што ў Гродна ён не толькі камандаваў палком, але і замяняў міністра беларускіх спраў Я. Варонку ў сувязі з яго частымі выездамі ў Коўна і правінцыю, а таксама кіраваў беларускім культурна-асветніцкім таварыствам “Бацькаўшчына” і выдаваў беларускую газету “Бацькаўшчына”. К. Езавітаў у сувязі з вялікай грамадскай нагрузкай і частымі камандзіроўкамі не меў магчымасці ў належнай меры заняцца справамі палка, правесці ў ім нацыянальнае выхаванне жаўнераў і афіцэраў і ўзмацніць яго як вайсковую сілу. Ён лічыў, што літоўцы зусім не жадалі вайсковага ўмацавання беларускіх частак, гэтак жа, як і не хацелі іх утварэння [13, с. 28]. Пасрэднікам паміж літоўскім міністэрствам абароны і беларускімі часткамі ў Гродна быў палкоўнік Б. Гедрайціс.

Загадам Міністэрства абароны літоўскага краю ад 11 сакавіка 1919 г. было дазволена з 27 лютага пачаць рэгістрацыю пры беларускім вайсковым стале, які займаўся наборам добраахвотнікаў, у беларускія часткі ў Гродна, роты добраахвотнікаў у Коўна ў складзе 200 жаўнераў. 12 красавіка рота ахвотнікаў была перайменавана ў 5-ю роту 1-га беларускага палка, камандзірам якой быў прызначаны афіцэр Яніцкі, але рота, як і раней, стаяла ў Коўна, з складу яе быў выдзелены вучэбны ўзвод для падрыхтоўкі афіцэраў у 2-гі батальён. Большасць салдат была не абмундзіравана, узбраенне роты складалі 18 старых германскіх адназарадных вінтовак [12, с. 24]. 17 красавіка пачалося таксама фарміраванне вартаўнічых атрадаў колькасным складам 40 чалавек.

У пачатку красавіка пачалася эвакуацыя нямецкіх войскаў з Гродна. Беларускі камендант горада М. Дзямідаў імкнуўся

ўзмацніць свой гарнізон і нават запрасіў 5-ю роту з Коўна для таго, каб супрацьстаяць палякам. 22 красавіка палякі захапілі Вільню. 28 красавіка нямецкія войскі перадалі палякам Гродна. У горадзе засталася большая частка салдат і афіцэраў 1-га беларускага палка.

Яшчэ напярэдадні гэтых падзей камандзір палка К. Езавітаў хацеў эвакуіраваць полк з Гродна і нават арганізаваў транспарт. Аднак з літоўскага і нямецкага Міністэрстваў абароны прыйшлі тэлеграмы аб затрымцы палка ў горадзе [6, с. 95]. Тады К. Езавітаў перадаў кіраўніцтва палком І. Антонаву і пераехаў у Коўна. 27 красавіка ў Гродна з’явіліся польскія часткі, якія абяззброілі беларускіх жаўнераў, арыштавалі частку афіцэраў і салдат. Газета “Беларуская думка” паведаміла, што 1-ы беларускі полк застаўся ў Гродна і працягваў гарнізонную службу, адносіны да яго польскага войска спакойныя [4].

Канчатковыя прычыны, па якіх беларускі полк застаўся ў Гродна, да сённяшняга часу невядомыя. Ёсць меркаванне, што большая частка афіцэраў разумела неабходнасць эвакуацыі з горада. Неаднаразова настойваў на эвакуацыі палкоўнік М. Лаўрэнцьеў. Прычыны, па якіх 1-ы беларускі полк застаўся ў Гродна, відавочна, непасрэдна звязаны з палітычным кантэкстам.

11 чэрвеня польскае камандаванне падзяліла салдат палка па веравызнанню. Каталікі былі накіраваны ў польскія адзінкі, праваслаўных і яўрэяў дэмабілізавалі. Такім чынам, 1-ы беларускі полк быў абяззброены палякамі [7, л. 160]. Раззбраенне ў Гродна беларускага палка, найбольшай беларускай вайсковай адзінкі, было для беларусаў вельмі значнай стратай. Беларускія гісторыкі ўскладаюць віну за гэта менавіта на польскі бок. Частка нацыянальных дзеячоў абвінавачвала літоўскі бок, які імкнуўся знайсці паразуменне з палякамі, не ўлічваючы інтарэсаў беларусаў. Засецкі М. лічыў, што беларускае войска засталося ў Гродна з-за недагляду Міністэрства абароны Літвы і сепаратнай палітыкі некаторых афіцэраў. Войска засталося ў зоне польскай акупацыі з умовай, што яно можа выйсці адтуль па свайму жаданню. На практыцы дамова з палякамі прывяла да таго, што, акрамя раззбраення, частка вайскоўцаў, асабліва афіцэраў, былі кінуты ў турмы [5, с. 6]. Раззбраенне палякамі 1-га беларускага палка значна пагоршыла і ўскладніла польска-беларускія адносіны.

З пераездам Міністэрства беларускіх спраў у Коўна ў красавіку

1919 г., сталіца Літвы на некаторы час стала цэнтрам беларускага нацыянальнага жыцця. Там працягвалі сваё развіццё беларускія вайсковыя адзінкі. Пасля ліквідацыі 1-га гродзенскага палка беларускія вайсковыя фарміраванні знаходзіліся ў цяжкім стане: засталіся 5-я рота Віленскага палка (каля 200 чалавек), вартаўнічая частка (40 чалавек) і эскадрон гусар.

У чэрвені 1919 г. у Коўна 5-я рота была перайменавана ў "1-ю асобную беларускую роту", а эскадрон у "2-ю асобную беларускую роту" [12, с. 24-25]. Гэтыя беларускія вайсковыя адзінкі прымалі ўдзел у баях супраць палякаў. 27 чэрвеня адбыўся агляд беларускай роты, на якім прысутнічаў літоўскі галоўнакамандуючы генерал С. Жукаўскас. Фактычна 1-я беларуская рота падпарадкоўвалася камандзіру Марыямпальскага асобнага батальёна, у складзе якога яна знаходзілася амаль што 4 месяцы.

10 кастрычніка 1919 г. у Коўна адбылася нарада, звязаная з пашырэннем беларускіх вайсковых фарміраванняў у Літве, на якой прысутнічалі міністр беларускіх спраў Я. Варонка, галоўнакамандуючы літоўскай арміі генерал Ф. Летукас, начальнік беларускага вайсковага бюро В. Казлоў, камандзіры беларускага эскадрона М. Глінскі і 2-й асобнай роты А. Ганзен [15, с. 12].

Загадам Галоўнакамандуючага ад 9 лістапада 1919 г. было расфарміравана беларускае вайсковае бюро, а яго кіраўнік В. Казлоў быў прызначаны афіцэрам сувязі пры Генеральным штабе Літвы для падтрымання зносін паміж Міністэрствам краёвай абароны, Міністэрствам беларускіх спраў і беларускім войскам [16, с. 16].

17 лістапада 1919 г. загадам па літоўскаму войску абедзве асобныя роты былі аб'яднаны ў Беларускі пяхотны батальён у складзе літоўскай арміі, камандзірам якога быў прызначаны маёр А. Ружанец-Ружанцаў (А. Смаленец). У пачатку снежня ў складзе батальёна былі сфарміраваны пададдзелы сувязі і кулямётны пададдзел. Былыя гусары сталі тэлефаністамі, коннікамі і г. д.

З студзеня 1920 г. служба ў беларускіх вайсковых частках праходзіла ў даволі спакойных умовах, але адносіны з палякамі былі не вельмі прыхільнымі. Гэты час быў выкарыстаны для выхавання ў салдат грамадзянскай свядомасці, павышэння іх адукацыйнага і культурнага ўзроўню. У гэтым напрамку было зроблена некалькі крокаў: створана вайсковая гістарычная камісія,

якая займалася зборам і апрацоўкай усіх матэрыялаў аб удзелу беларусаў у беларуска-літоўскіх фарміраваннях; з канца 1919 г. на беларускай мове выдаваўся часопіс "Варта Бацькаўшчыны", у якім друкаваліся афіцыйная хроніка, творы афіцэраў, жаўнераў, карыкатуры і малюнкі з вайсковага жыцця [8, л. 18]. Вялікую дапамогу ў адукацыйна-культурнай справе аказваў міністр беларускіх спраў Я. Варонка.

1 красавіка 1920 г. Беларускі асобны батальён быў перафарміраваны ў Беларускую асобную роту, камандзірам якой застаўся А. Ружанцаў [12, с. 28]. Колькасць беларускіх адзінак была значна зменшана. Беларускія часткі знаходзіліся на дэмаркацыйнай лініі з палякамі на ўчастку Клічава-Галайдайка-Антокаль-Кіркаліс з штабам у маёнтку Рудмінішкі і ў Казлоўшчыне [12, с. 29].

У сувязі з падпісаннем 12 ліпеня 1920 г. савецка-літоўскага дагавора адбыліся значныя змены ў становішчы беларускіх вайсковых адзінак у Літве. Згодна з дагаворам, Літва павінна была атрымаць Вільню, Гродна і Ліду, таму літоўскія войскі рушылі за дэмаркацыйную лінію і пачаліся сутычкі з палякамі. Разам з літоўскім войскам рушыла наперад і беларуская рота. З другой паловы жніўня 1920 г. беларускія жаўнеры неслі пагранічную службу пад Браславам. Знаходжанне беларускіх салдат на гэтай тэрыторыі садзейнічала нацыянальнаму адраджэнню, пачала развівацца беларуская мова, ставіліся беларускія спектаклі, распаўсюджвалася беларуская газета "Пагоня", у Браславе была створана пажарная служба.

27 верасня 1920 г. у Вільні пачалося фарміраванне Беларускага асобнага батальёна (БАБ), камандзірам якога быў прызначаны палкоўнік, загадчык афіцэрскіх курсаў М. Успенскі [8, л. 11].

Пасля захопу войскамі генерала Л. Жалігоўскага Віленшчыны і ўтварэння Сярэдняй Літвы фарміраванне БАБ было перанесена ў Коўна, асобная беларуская рота не ўвайшла ў склад батальёна, а працягвала заставацца на фронце. 31 кастрычніка адбыліся змены ў кіраўніцтве роты: маёр А. Ружанцаў быў адазваны ў Коўна, а камандзірам на яго месца прызначаны штабс-капітан Благавешчанскі. Літоўцы вырашылі зрабіць БАБ ідэалагічным і падрыхтоўчым цэнтрам антыпольскага партызанскага руху на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Беларускія жаўнеры прымалі ўдзел у барацьбе з палякамі. Гэта працягвалася да вясны 1923 г.,

калі вядучыя заходнееўрапейскія дзяржавы прызналі ўсходнюю мяжу Польшчы разам з тэрыторыяй Сярэдняй Літвы.

У той час назіраліся значныя змены ў беларуска-літоўскім супрацоўніцтве. 20 лістапада 1920 г. быў заключаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж урадамі БНР і Літвы. Згодна з ім, В. Ластоўскі пагадзіўся на выкарыстанне беларускіх вайсковых фарміраванняў, створаных на літоўскай тэрыторыі, для абароны літоўскіх зямель. У сувязі з гэтым бакі падпісалі асобныя ўмовы [2, с. 954].

Яшчэ 19 лістапада 1920 г. А. Аўсяннік, прадстаўнік БНР у Літве, падаў міністру замежных спраў Літоўскай рэспублікі праект фарміравання беларускага нацыянальнага войска на літоўскай тэрыторыі. Згодна з ім, урад БНР абавязваўся прыступіць да фарміравання беларускага нацыянальнага войска як шляхам падбору ахвотнікаў, так і мабілізацыі сваіх грамадзян на тэрыторыі Літвы. Урад БНР абавязваўся падпарадкоўваць сваё войска Галоўнаму штабу літоўскай арміі, у склад якога павінны ўвайсці прадстаўнікі Міністэрства абароны Беларусі. Падрыхтоўку беларускага войска, экіпіроўку і поўнае ўтрыманне брала на сябе Літоўская рэспубліка да часу ўступлення беларускага войска на ўласную тэрыторыю [9, л. 8].

1 снежня 1920 г. у Коўна была пераведзена 1-я рота і ўзвод кулямётнай роты, дзе яны былі ўрачыста сустрэты і ўвайшлі ў склад Беларускага батальёна, у які ўваходзіла каля 500 чалавек.

4 студзеня 1921 г. была адноўлена камісія па культурна-адукацыйнай працы ў батальёне ў складзе падпаручыка Маёрава і прапаршчыкаў Якаўлева і Дубяс.

У сувязі з распачатым польска-літоўскім канфліктам урад БНР 29 сакавіка накіраваў ўраду Літвы даклад аб палітычным стане на Беларусі, у якім прапанаваў цэлы шэраг мерапрыемстваў, якія датычыліся пашырэння беларускіх вайсковых частак у літоўскім войску. Ён прапаноўваў літоўскім уладам больш увагі ўдзяляць фарміраванню нацыянальна-свядомых беларускіх вайсковых адзінак у складзе літоўскага войска, якія б вялі барацьбу на баку Літвы [2, с. 1068]. Падчас польска-літоўскага канфлікту літоўцы вырашылі выкарыстаць беларускія вайсковыя фарміраванні для барацьбы за Вільню. Літоўскі ўрад імкнуўся ўзняць на тэрыторыі Сярэдняй Літвы паўстанне, накіраванае супраць ўключэння Вільні і

Віленшчыны ў склад Польшчы. Важная роля пры гэтым адводзілася беларускім вайсковым адзінкам у Літве. Аднак узняць паўстанне так і не ўдалося.

У канцы красавіка 1921 г. літаратурны аддзел літоўскага Генеральнага штаба пачаў выдаваць для беларускіх частак літоўскай арміі на беларускай мове двухтыднёвы часопіс "Вайсковы" [10, с. 29]. Рэдактарам выдання быў начальнік вайсковай бібліятэкі маёр А. Ружанцаў Дакладна яшчэ не вызначана, як доўга выходзіла гэтае выданне. Ёсць меркаванне, што яно існавала да студзеня 1922 г. Галоўная задача "Вайсковага" была вызначана наступным чынам: "навучыць змагацца супраць ворага са зброяй, а пасля жыць у вольнай, шчаслівай і незалежнай Літве" [3]. Двухтыднёвік быў вельмі разнастайным па характару сваіх матэрыялаў, меў некалькі рубрык і карыстаўся папулярнасцю сярод беларускіх жаўнераў, бо на яго старонках публікаваліся творы, прасякнутыя пачуццямі мужнасці і патрыятызму. За час існавання беларускіх адзінак іх афіцэры знаходзілі час і сродкі для правядзення культурна-адукацыйнай працы сярод сваіх падначаленых, што ўзнімала узровень нацыянальнай свядомасці і адукацыі апошніх.

25 красавіка 1921 г. беларускі батальён быў перафарміраваны ў Асобную беларускую роту, якая ў тым жа годзе была расфарміравана. Беларускія вайсковыя фарміраванні ў Літве спынілі сваё існаванне.

Дзейнасць беларускіх вайсковых фарміраванняў у Літве – з'ява цікавая і складаная. Імкненне стварыць свае ўласныя ўзброеныя сілы было заўсёды моцным сярод беларускіх нацыянальных дзеячоў. Але зрабіць гэта Беларуская Народная Рэспубліка так і не здолела, хоць беларусы вельмі разлічвалі на дапамогу літоўцаў. Яны спадзяваліся, што ў будучым гэтыя часткі змогуць стаць зародкам беларускага нацыянальнага войска. На пачатку літоўскі бок быў таксама зацікаўлены ў вайсковым супрацоўніцтве. Яго ўласныя ўзброеныя сілы былі нязначнымі, а пагроза незалежнасці для Літвы з боку Польшчы і Савецкай Расіі была рэальнай. Таму для дасягнення сваіх палітычных мэтаў літоўскія дзеячы вельмі разлічвалі на дапамогу беларускіх вайсковых частак. Аднак гэтая зацікаўленасць была нядоўгай. У 1923 г. вядучыя еўрапейскія дзяржавы прызналі ўсходнюю граніцу Польшчы разам з

тэрыторыяй Сярэдняй Літвы. У сувязі са зменай міжнароднай сітуацыі літоўскі бок страціў інтарэс да супрацоўніцтва з беларусамі, у тым ліку, і ваеннага.

Выкарыстаная літаратура

1. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі: У 2 кн. / Беларускі Інстытут Навукі і Мастацтва; Склад. С. Шупа. – Вільня – Нью-Ёрк – Мінск – Прага, 1998. – Т. 1. – Кн. 1. – 860 с

2. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі: У 2 кн. / Беларускі Інстытут Навукі і Мастацтва; Склад. С. Шупа. – Вільня – Нью-Ёрк– Мінск – Прага, 1998. – Т. 1. – Кн. 2. – 1721 с

3. Астрога, В. Марш да Беларусі // Голас Радзімы. – 1998. – 30 красавіка.

4. Беларуская думка. – 1919. – 16 мая.

5. Засецкі, М. Міністэрства беларускіх спраў за 10 месяцаў існавання. Кароткі нарыс // Часопіс Міністэрства Беларускіх Спраў. – 1919 – № 1. – С. 3-9.

6. Latyszonek, O. Bialoruskie formacje wojskowe 1917-1923. Bialorus. T-wo. Historyezne. – Bialystok, 1995. – 273 s.

7. Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 325 (Фонд БНР). – Воп. 1. – Спр. 22. – Л. 42, 43, 160.

8. Там жа. – Ф. 325. – Воп. 1. – Спр. 27. – Л. 11, 18.

9. Там жа – Ф. 325. – Воп. 1. – Спр. 57. – Л. 8.

10. Там жа. – Ф. 325. – Воп. 1. – Спр. 178. – Л. 29.

11. Наше утро. – 1918. – № 6.

12. Ружанцаў А. Беларускія войскі ў Літве. 1918-1920 гг. Кароткі вайскова-гістарычны агляд // Спадчына. – 1993. – № 4. – С. 23-36.

13. Уласнаручныя паказанні Езавітава К. З арх. КДБ // Полацак. – 1993. – №. 4. – С. 27-31.

14. Часопіс Міністэрства Беларускіх Спраў. – 1919. – № 1.

15. Часопіс Міністэрства Беларускіх Спраў. – 1919. – № 2.

16. Часопіс Міністэрства Беларускіх Спраў. – 1919. – № 3-4.